**Паведамленне для выбаршчыкаў аб магчымасці прагаласаваць на выбарах датэрмінова на ўчастку для галасавання**

У адпаведнасці з артыкулам 53 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь выбаршчык, які не мае магчымасці ў дзень выбараў прыняць удзел у галасаванні, мае права не раней чым за пяць дзён да выбараў запоўніць у памяшканні ўчастковай камісіі бюлетэнь і апусціць яго ў апячатаную асобную скрыню для галасавання выбаршчыкаў. Афіцыйнага пацверджання прычын немагчымасці выбаршчыка прыйсці ў памяшканне для галасавання ў дзень выбараў не патрабуецца.

**Датэрміновае галасаванне ажыццяўляецца з 21 па 25 студзеня 2025 года з 12 да 19 гадзін без перапынку.**

Датэрміновае галасаванне не праводзіцца на ўчастках для галасавання, утвораных у месцах часовага знаходжання выбаршчыкаў (у бальніцах, санаторыях, дамах адпачынку і іншых месцах часовага знаходжання).